# СВАБОДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

№ 2 (51), 11 – 17.01.2007 г.

# “ДРУЖБЕ” – ТРУБА

## МАСКВА ПАРАЎНАЛА ЛУКАШЭНКУ СА СТЫХІЙНЫМ БЕДСТВАМ



KAMUNIKAT.org

Калі апошнія дні перад Новым годам прайшлі пад знакам беларуска-расійскага газавага супрацьстаяння, дык на праваслаўныя Каляды разгарэўся новы канфлікт – цяпер ужо з-за нафты.

Урад Беларусі прыняў рашэнне з 1 студзеня ўвесці мыта на транзіт расійскай нафты ў Цэнтральную і Заходнюю Еўропу – Польшчу, Германію, Венгрыю, Славакію і Чэхію, а таксама ва Ўкраіну. Мыта склала 45 даляраў за тону. Расійскі бок быў пастаўлены перад фактам 4 студзеня, пасля нарады ў Лукашэнкі. Праўда, трэба адзначыць, што яшчэ ў снежні Масква ў аднабаковым парадку заявіла аб увядзенні ўвазнога мыта на нафту для Беларусі ў памеры 180 даляраў за тону. Беларусь ад яе закупак у Расіі адмовілася.

Многія палічылі абкладанне нафты мытам эмацыйным адказам расейцам – маўляў, прайграўшы газавую спрэчку, Лукашэнка ўсё адно пакінуў апошняе слова за сабой. Але наўрад ці гэтым можна ўсё патлумачыць.

Асноўная прычына ўвядзення мыта на пампаванне расійскай нафты праз трубаправод “Дружба” па тэрыторыі Беларусі – неабходнасць залатаць дзіркі ў беларускім бюджэце. Не сакрэт, што беларуская эканоміка развівалася апошнім часам у асноўным за кошт танных энергарэсурсаў з Расіі. Менавіта дзякуючы нізкім цэнам на газ і продажу за мяжу расійскай нафты ў Беларусі выплочваліся адносна высокія заробкі і пенсіі, падтрымліваліся стратныя прадпрыемствы, у першую чаргу – ў сельскай гаспадарцы. Страціўшы танныя энерганосьбіты, Беларусь упершыню сутыкнулася з перспектывай рэальнага эканамічнага крызісу.

У новай сітуацыі ўладам РБ трэба было хоць нешта рабіць. Вось “нешта” і прыдумалі. Чытач можа задаць пытанне – няўжо Лукашэнка і яго памочнікі ўсур’ёз спадзяваліся, што Расія “праглыне” ўвядзенне мыта на транзіт яе нафты?

Тлумачэнні такіх паводзінаў могуць быць розныя. Папершае, расійскі бок раней і не такое “глытаў”. А па-другое, са стратэгіяй і тактыкай у кіраўніцтва Беларусі яўна ёсць праблемы.

Але расійскі бок моўчкі “глытаць” беларускае мыта на сваю нафту адмовіўся.

Хаця спачатку, у сувязі з навагоднімі святамі, што цягнуліся ажно восем дзён, у Маскве рэагавалі даволі млява.

Адно толькі намеснік міністра эканамічнага раз-

**Працяг на стар.5**

## ВЫБАРЫ БЕЗ ВЫБАРАЎ:

### ЦІ ТРЭБА Ў ІХ УДЗЕЛЬНІЧАЦЬ

► СТАР. 2, 4

## З НОВЫМ ГАЗАМ, ПРАФЕСАР!

### АГЛЯД НАВАГОДНЯЙ ПРЭСЫ

► СТАР. 6

# ЦІ ТРЭБА, НА ВАШУ ДУМКУ, УДЗЕЛЬНІЧАЦЬ У МЯСЦОВЫХ ВЫБАРАХ 14 СТУДЗЕНЯ?

**ГАЛІНА, ВЯСКОВАЯ ПЕНСІЯНЕРКА:**

## "Я НА ВЫБАРЫ НЕ ПАЙДУ"

Я на гэныя выбары не пайду. Я нікому не веру і пакрыўджаная на Лукашэнку. Чаго ён ездзіць па багатых калгасах і красуецца? Хай бы прыехаў у бедную вёску ды паглядзеў, як дажываюць людзі. У якіх хатах. Які толк ад гэтых дэпутатаў? Лепш усё роўна не будзе.

**УЛАДЗІМІР МАЦКЕВІЧ, ФІЛОСАФ:**

## "КАЛІ ЁСЦЬ АЛЬТЭРНАТЫВА – ТРЭБА ЯЕ ПАДТРЫМАЦЬ"

Калі б было вырашана нашымі палітыкамі не прымаць удзелу раней, то было б добра. Можна было б разгарнуць барацьбу за давядзенне да свядомасці людзей, што гэтыя выбары несапраўдныя. Ёсць некалькі пунктаў, па якіх можна гэта пазначыць. У тым ліку – выбарчыя камісіі, сфармаваныя без удзелу апазіцыйных партыяў. Зараз, калі на тваім участку ёсць альтэрнатыўны кандыдат, дык трэба прыйсці і падтрымаць яго. А калі няма – дык што там рабіць?

**ВАЛЕРЫ, ІНЖЫНЕР-БУДАЎНІК:**

## "ЗА КАГО МНЕ ГАЛАСАВАЦЬ?"

Я быў на сустрэчы з двума кандыдатамі. Пайшоў туды, бо хацелася ж паглядзець на гульню з альтэрнатывай. Адзін – прыгожы малады бээнэфавец у добрым гарнітуры, прыехаўшы на няхілай "Аўдзі". Другі – тыповы савецкі сталаначальнік. Пляшывы, касназыкі і злы. Дык вось, прыгажун-бээнэфавец, які працуе ў нейкай стратэгічна-экспертнай карпарацыі, задэклараваў свой гадавы даход у два мільёны рублёў. Гэта значыць, менш за сто баксаў у месяц. І на поўным сур'ёзе даводзіў мне, што ён жыве на гэтыя грошы. Разам з машынай і бензінам. Не люблю, калі з мяне робяць ідыёта. Ён казаў, як ён прыцягне інвестыцыі ў наш родны кут. Слухаць яго было і сорамна, і смешна. А былы камсамолец доўга і нудна распавядаў, колькі будзе пакладзена новых вадаправодных трубаў, дзе якая ЦЭЦ будзе адрамантаваная ды пра іншыя гаспадарчыя справы. Адзін на прыгожай беларускай мове мне хлусіў, а другі на трасянцы намагаўся ўдаваць праўду. За каго мне галасаваць?

**АЛЕСЬ МІХАЛЕВІЧ, НАМЕСНІК СТАРШЫНІ ПАРТЫІ БНФ, ДЭПУТАТ МЯСЦОВАГА САВЕТА:**

## "ТРЭБА ПАКАЗАЦЬ"

Усё залежыць ад таго, ці ёсць нармальныя кандыдаты ад апазіцыі. Калі яны ёсць, чаму не пайсці? Можна схадзіць і падтрымаць. Прынамсі, людзі ў камісіях, якія будуць фальшаваць вынікі, будуць бачыць, што гэтыя галасы былі. Але, канечне, ад гэтага на выбарах залежыць вельмі мала. Няма шанцаў на нейкую перамогу. Але трэба ў чарговы раз паказаць, што незалежнае грамадства ёсць.

**АЛЯКСАНДР, ПРАДПРЫМАЛЬНІК:**

## "ШТО НАМ НА ІХ РАБІЦЬ?"

Не трэба туды хадзіць ніколі. Выбары ў нас павінны быць толькі адны – прэзідэнцкія. І ніякія іншыя. Пакуль мы не здабудзем магчымасці рэальна ўплываць на сумленны падлік галасоў на галоўных выбарах, што нам рабіць на астатніх? Масоўкай быць? Падыгрываць ім? Асабіста я – пас.

**ПАЎЛЮК КАНАВАЛЬЧЫК, ЖУРНАЛІСТ:**

## "ВЫБАРЫ ПЕРАТВАРЫЛІСЯ Ў РЫТУАЛ"

Складанае пытанне. Бо, як прыйдзеш на выбары, дык там і чарку нальюць і закусіць дадуць. Таму, я думаю, што на ўчастак варта пайсці. А вось ці ісці да скрыняў – гэтае пытанне можна пакінуць адкрытым. Выбары ж у нас пераўтварыліся ў рытуал, ледзь не ў нацыянальную традыцыю. Усё адно, як на гэтых, так і на астатніх выбарах нічога не вырашаецца. Рытуал ёсць рытуал. Песні, скокі, радасць і весялуха. Сам я, на жаль, у гэты час не буду на месцы. Таму не давядзецца мне паяднацца з усім нашым народам падчас галасавання.

**ВОЛЬГА, НАСТАЎНІЦА:**

## "Я НА МЯСЦОВЫЯ ВЫБАРЫ НЕ ХАДЖУ"

Я на так званыя "выбары" мясцовага разліву не хаджу і ніколі не пайду. Можа, калі б там не было выязных "выпівалак", я б і пайшла. А так... Чым яны мяне хочуць купіць? Каўбасой і півам? Хай гэтыя кандыдаты самі ўсё гэта і п'юць.

**АЛЕСЬ ПУШКІН, МАСТАК:**

## "БУДЗЕ ПРЫЗНАЧАНАЯ НОВАЯ ГВАРДЫЯ ЧЫНОЎНІКАЎ"

Вядома, не варта. Яны ўжо распісаныя і прызначаныя, людзі гэтыя ў саветах. Але што цікава – па тэлебачанні кажуць пра закон, па якім чыноўнік будзе адказваць і на любога чыноўніка будзе ўправа. Перад выбарамі ўжо мусіруецца тэма, што чыноўнікі будуць вельмі аддана служыць народу. Будуць вельмі баяцца цыганіны, скаргаў насельніцтва. Мне здаецца, улада ведае сцэнар жыцця на бліжэйшыя пяць гадоў. Яны прызначаць новую гвардыю людзей, якія на службе выраслі пры Лукашэнку. І тут будзе ўсё нармальна. Яны будуць працаваць значна лепей, чым мінулыя чыноўнікі.

**ВІТАЛЬ КАРАТЫШ, КАНДЫДАТ АД ПАРТЫІ БНФ, ЛУНІНЕЦ:**

## "ЛЮДЗЯМ ПАТРЭБНАЯ АЛЬТЭРНАТЫВА"

Я вырашыў прыняць удзел. Я проста захацеў не тое, што адпомсціць... А проста не даць махляваць надалей нашай выбарчай раённай камісіі. Але не толькі гэта. Я думаю, што людзям патрэбная альтэрнатыва. Хоць нейкая магчымасць ёсць выйсці да народа і нешта сказаць. І хай гэта фарс, але варта прыняць удзел, каб гэта падкрэсліць. Вось такая мая пазіцыя. Мая акруга вельмі маладая, жывая. Таму, думаю, выбары будуць. Калі нават яны і падтасуюць галасы, дык пэўны час рэзананс будзе трымацца: "Дзе справядлівасць?" А тое, што падтасуюць галасы, у гэтым я ўпэўнены.

# “СВАБОДУ КАСТУСЮ ЛУКАШОВУ!”

Палітычная рада Аб’яднаных дэмакратычных сілаў выступіла з патрабаваннем вызваліць з-за кратаў свайго актывіста Кастуся Лукашова.

Ён быў затрыманы 19 снежня і адпраўлены ў следчы ізалятар па абвінавачанні ў “супраціве супрацоўнікам міліцыі”. Як адзначаецца ў заяве, прычынай затрымання стаў эпізод вясны мінулага году, калі Кастусь Лукашоў вывез з бальніцы свайго брата, удзельніка падзеяў на Кастрычніцкай плошчы ў Мінску, Вячаслава Сіўчыка.

Такім чынам, гаворыцца ў заяве, “улады працягваюць пераслед актывістаў Мінскай вясны – 2006. Гэтым яны дэманструюць не толькі сваю слабасць, але й нежаданне лічыцца з меркаваннем міжнароднай супольнасці пра неабходнасць дэмакратычных зменаў у Беларусі”.

Аб’яднаныя дэмакратычныя сілы патрабуюць тэрміновага й неадкладнага вызвалення палітычнага вязня і звяртаюцца да ўрадаў, парламентаў, міжнародныях арганізацыяў свету з просьбай “узвысіць свой голас у падтрымку К.Лукашова і ўсіх палітычных вязняў лукашэнкаўскага рэжыму”.

# НАЦБОЛЫ – ЗА САЮЗ

15 актывістаў так званай Нацыянал-бальшавіцкай партыі (НБП) правялі 10 студзеня акцыю пратэсту каля будынка консульства Расіі ў Мінску. Як паведаміў БелаПАН прадстаўнік НБП Аляксандр Аверын, акцыя цягнулася амаль гадзіну. “Нацболы” блакавалі ўваход у консульства, прыкулі сябе да дзвярэй ланцугамі, вывесілі транспарант «Союз дороже газа!» і скандавалі: «Нет газовому шантажу!».

Паводле Аверына, ніхто з удзельнікаў акцыі не быў затрыманы. “Пад’ехалі супрацоўнікі міліцыі, даведаліся аб мэце акцыі і проста папрасілі разысціся”. Ён таксама адзначыў, што супрацоўнікі консульства не раэгавалі на акцыю нацболаў.

# А.ВАЙТОВІЧ: “ЛУКАШЭНКА НІКОМУ НЕ ДАВЯРАЕ, АКРАМЯ СЫНА”

Прызначэнне старэйшага сына Аляксандра Лукашэнкі Віктара сябрам Рады бяспекі пракаментаваў былы сябра гэтай структуры акадэмік Аляксандр Вайтовіч:

«Лукашэнка рыхтуе сабе пераемніка. А паколькі ён нікому не давярае, акрамя сына, дык, зразумела, што наступным прэзідэнтам ён бачыць Віктара. Менавіта ў гэтым кантэксце і трэба разглядаць прызначэнне сына кіраўніка дзяржавы сябрам Рады бяспекі — структуры, сяброўства ў якой вельмі абмежаванае і ўключае вузкае кола людзей, выключна ў адпаведнасці з іхнымі пасадамі.



**Аляксандр і Віктар** *Лукашэнкі на зімовым адпачынку. Фота з архіву.*

Аляксандр Лукашэнка разумее, што перадача вышэйшых дзяржаўных паўнамоцтваў сыну — гэта адзінае выратаванне для яго. Калі прыйдзецца сыходзіць з гэтай пасады, дык для таго, каб прыхаваць усё тое, што было пры ім, а, можа, нават і не адказваць за нейкія справы, ёсць толькі адно выратаванне — сын».

**Паводле Радыё Свабода**

## Суседзі

# ПОЛЬШЧА ЯК АХВЯРА НАФТАВАЙ ВАЙНЫ

***Польшча ўжо не ўпершыню становіцца ахвярай беларуска-расійскага супрацьстаяння, якое мае палітычную падаплёку.***

У ноч з 7-га на 8-га студзеня ў Адамаве, першым памежным пункце нафтаправоду “Дружба” пабачылі, што напор у трубе выразна паменшыўся, а неўзабаве пастаўка зусім спынілася. Зразумела, палякі адразу звярнуліся да адказнага за пампаванне прадпрыемства “Гомельтранснафта”. Там ветліва адказалі, што з беларускага боку ўсё ў парадку. Ну, не маглі ж ім адразу сказаць, што ў Беларусі пачалі адбор прызначанай для Захаду нафты з-за таго, што Расія не пагадзілася на беларускае транзітнае мыта. А Расія, адпаведна, прыкруціла нафтавы кран у сябе.

Расійская “Транснафта” хутка прызналася, што гэта яе ініцыятыва – спыніць пастаўкі сыравіны на Захад праз Беларусь з-за таго, што беларускі бок, нібыта, яе крадзе.

Што палякам да гэтай беларуска-расійскай барацьбы за справядлівасць? А тое, што ў іх могуць спыніцца прадпрыемствы перапрацоўкі нафты. Праўда, як запэўнівае намеснік міністра эканомікі Пётр Наімскі, запасаў хопіць у Польшчы на 80 дзён. А што далей?

Пакуль у Варшаве вырашаюць, каму і ў якой форме прад’явіць прэтэнзіі за зрыў паставак, каб атрымаць кампенсацыю. Але хто будзе кампенсаваць? Беларусь ці Расія? Да каго звяртацца? Гэта добрае пытанне, улічваючы складанасць адносінаў Польшчы з абедзьвюма краінамі. Але згодна з міжнародным правам Расія выступае пастаўшчыком, а значыць, яна абавязаная гарантаваць транзіт без перашкодаў праз замежныя тэрыторыі. Гэта значыць, калі яна не змагла дамовіцца з “прамежкавымі дзяржавамі”, дык гэта яе, Расіі, праблема.

Аднак, два з нечым месяцы – тэрмін, на які разлічаныя запасы – прабягуць хутка. Зразумела, палякі разлічваюць, што беларуска-расійскі нафтавы канфлікт вырашыцца значна раней. Але зноў зрабілася актуальнай даўняя тэма дыверсіфікацыі дастаўкі энергетычнай сыравіны. Зноў загаварылі пра даўні праект трубаправоду Адэса-Броды-Гданьск. 96% нафты Польшча сёння атрымлівае праз “Дружбу”. Такая залежнасць закранае нацыянальныя пачуцці і дае повад польскай публіцыстыцы папракаць урад за недахоп увагі да праблемаў энергетычнай бяспекі.

Так супала, што ў гэтыя дні ў Ігналіне пачаліся перамовы польскага ўраду з Літвой, Латвіяй і Эстоніяй аб сумесным будаўніцтве новай АЭС. Тэрмін яе пабудовы – недзе паміж 2015-м і 2020-м гадамі. Тым часам ужо 60% палякаў (якія раней баяліся жахаў Чарнобыля) падтрымліваюць ідэю гэтага будаўніцтва. Страх перад Расіяй перамагае страх перад радыяцыяй.

Польскі эксперт Марэк Галішэўскі раіць рыхтавацца да доўгатэрміновага канфлікту паміж Беларуссю і Расіяй. Ён лічыць, што для Польшчы было б лепей лічыць цяперашнія падзеі следствам рашэння толькі беларускага боку. Тады можна было б наваліцца ўсім Еўрасаюзам на кіраўніка Беларусі.

У дачыненнях з афіцыйным Мінскам у Варшавы і без нафты хапае праблемаў. Хоць бы вакол Саюзу палякаў Беларусі, не кажучы пра ўсё астатняе.

Але праблема энергетычнай бяспекі, лічаць палякі, мае еўрапейскі характар і таму павінна вырашацца на адпаведным узроўні.

**Паводле www.nmby.org**

# КОНКУРС — 1,1 ЧАЛАВЕКА НА МЕСЦА

## У ПЕРАВАЖНАЙ КОЛЬКАСЦІ АКРУГАЎ ВЫБАРЫ ПРОЙДУЦЬ БЕЗ ВЫБАРУ

### Галасаванне пачалося

Выбары дэпутатаў мясцовых Саветаў прызначаныя на нядзелю, 14 студзеня.

9 студзеня пачалося датэрміновае галасаванне. 6526 выбарчых участкаў працуюць у дзве змены – з 10-00 да 14-00 і з 16-00 да 19-00. Для таго, каб прагаласаваць датэрмінова, не трэба ніякіх тлумачэнняў, дастаткова прыйсці на ўчастак з пашпартам, ці з дакументам, якія яго замяняе. Гэта можа быць студэнцкі або ваенны білет, пасведчанне інваліда, ці нават даведка… аб страце пашпарта.

Усяго будуць сфармаваныя 1 581 мясцовы Савет у складзе больш за 22 658 дэпутатаў.

У выбарах у Беларусі змогуць прыняць удзел больш за 7 мільёнаў выбарцаў, у тым ліку грамадзяне Расійскай Федэрацыі. Паводле інфармацыі Цэнтрвыбаркаму ў якасці кандыдатаў у дэпутаты балатуюцца, сярод іншых, чацвёра грамадзянаў РФ.

У пераважнай большасці акругаў выбары пройдуць на безальтэрнатыўнай аснове. Сярэдні конкурс па краіне склаў 1,1 чалавека на месца. Выключэнне – толькі абласныя цэнтры і Мінск. У сталіцы конкурс – у сярэднім 3 чалавекі на месца.

Адметнасць гэтых выбараў у тым, што яны пройдуць у адзін тур. Колькі б людзей ні прыйшло да выбарчых скрыняў, выбары будуць прызнаныя адбытымі.



**Міліцыя складае пратакол** *на старшыню Аб'яднанай грамадзянскай партыі* ***Анатоля Лябедзьку*** *і грамадскую актывістку* ***Крысціну Шацікаву*** *за арганізацыю пікета пратэсту супраць парушэння ўладамі выбарчага заканадаўства. Мінск, 5 студзеня 2006 году.*

### У эфіры гучала музыка

*«Скажу шчыра, наша самае слабое звяно – інфармацыя аб кандыдатах у дэпутаты. Скаргі ў Цэнтральную камісію паступаюць менавіта на недахват інфармацыі», — паведаміла 9 студзеня ў інтэрв'ю БТ старшыня ЦВК Лідзія Ярмошына. Яна патлумачыла гэта неактыўнай работай саміх кандыдатаў, а таксама праблемай "з размяшчэннем заказаў на выраб друкаванай прадукцыі, таму што друкарні былі перапоўненыя навагоднімі і калляднымі заказамі". А што тычыцца выступаў па радыё, дык паводле Ярмошынай, частка кандыдатаў "баяцца мікрафона, яшчэ не прывыклі".*

А вось як выглядае сітуацыя на месцах. З паведамленняў прэс-службы грамадскага аб'яднання "Беларуская асацыяцыя журналістаў":

"Выступ кандыдата ў дэпутаты Бярозаўскага райсавету, сябра Партыі БНФ Анатоля Сахарушы не прагучаў у эфіры мясцовага радыё ў вызначаны час. Тэкст радыёзвароту да выбарцаў быў запісаны яшчэ напярэдадні Новага году і павінен быў прагучаць у 6.30 раніцай 3 студзеня па правадной сетцы ў эфіры раённага радыё.

Аднак слухачы пачулі толькі выступы іншых кандыдатаў у дэпутаты. Калі Анатоль Сахаруша звярнуўся па тлумачэнні да кіраўніцтва Бярозаўскага раённага вузла сувязі, дык атрымаў адказ, што ягоны выступ не адбыўся з-за тэхнічных непаладак. Выступ спадара Сахарушы прагучаў толькі ў дзённым эфіры (калі колькасць слухачоў істотна скарачаецца) разам з паўторам выступаў іншых кандыдатаў….

28 снежня ў Гомелі таксама не прагучаў у запланаваны час зварот да выбарцаў кандыдата ў дэпутаты Гомельскага гарсавету ад БНФ Уладзіміра Шыцікава. Паводле кіраўніцтва радыё, здарылася "тэхнічная накладка". Замест выступу ў эфіры гучала музыка".

### Зрабіць тое, што магчыма

У Бабруйску трое кандыдатаў ад апазіцыі – сябры Сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) знялі свае кандыдатуры, спаслаўшыся на немагчымасць атрымаць дазвол ад мясцовай улады на правядзенне сустрэч з выбарцамі нават у вызначаных месцах.

У Гомельскай вобласці тры кандыдаты знялі свае кандыдатуры з выбараў у мясцовыя саветы на знак пратэсту супраць зрыву сустрэч лідэра аб'яднаных дэмакратычных сіл Аляксандра Мілінкевіча з выбарцамі.

Аналагічныя паведамленні прыходзілі з Брэста, Гомеля, Гродна, іншых рэгіёнаў.

Экс-кандыдат у прэзідэнты Аляксандр Мілінкевіч, які браў удзел у выбарчай кампаніі многіх дэмакратычных кандыдатаў на правах даверанай асобы, рэзка негатыўна ацаніў падобныя дзеянні. У ягонай заяве, апублікаванай 4 студзеня на сайце Milinkevich.org, у прыватнасці, гаворыцца:

"На больш як 24 тысячы акругаў апазіцыйныя палітычныя партыі выставілі разам менш за 1000 кандыдатаў, але і гэтая лічба, па звестках інфармаваных людзей, завышаная ледзь не ў два разы. У некаторых выпадках нават вядучыя палітыкі, спрабуючы зарэгістравацца, не змаглі фармальна выканаць элементарныя патрабаванні заканадаўства. Склалася ўражанне, што лідэры партый не ведалі, у якіх умовах давядзецца праводзіць выбарчую кампанію. Размовы пра тое, што ўлады не друкуюць улёткі, забараняюць сустрэчы, гучаць неперакананўча…

*У гэтых умовах мы вымушаныя былі зрабіць тое, што магчыма – збіралі подпісы, сустракаліся з выбарцамі, дэмакратычным актывам у 26 гарадах Беларусі. Да дня выбараў папрацуем яшчэ ў 15 населеных пунктах. Трэба да канца выкарыстаць усе магчымасці для інфармавання людзей і толькі пасля прымаць рашэнне здымаць ці не здымаць кандыдатаў".*

На думку лідэра аб'яднанай апазіцыі, палітычную кампанію пад назвай "Мясцовыя выбары" можна назваць няўдалай.

Трэба думаць, што адказнасць за гэта нясуць усе ўдзельнікі кампаніі. У кожным выпадку, канчатковую ацэнку можна будзе даць толькі па яе выніках.

**Аглядальнік**

# “ДРУЖБЕ” – ТРУБА

## МАСКВА ПАРАЎНАЛА ЛУКАШЭНКУ СА СТЫХІЙНЫМ БЕДСТВАМ

**Працяг. Пачатак на стар. 1**

віцця і гандлю (МЭРГ) Расіі Андрэй Шаронаў абвінавакціў беларускі бок у невыкананні “раней дасягнутых дамоўленасцяў” і міжнародных нормаў транзіту, ды неяк туманна прыгразіў нейкімі санкцыямі ў адказ.

Урад РБ на папярэджанні не рэагаваў. Наадварот, расійскую кампанію “Транснафта” беларуская мытня абвінаваціла ў кантрабандным перасоўванні тавару праз тэрыторыю краіны, а суд Цэнтральнага раёна Гомеля нават выклікаў прэзідэнта “Транснафты” Сямёна Вайнштока ў якасці праваправарушальніка.

Аднак, у панядзелак, калі ў канфлікт былі ўцягнутыя ўжо Польшча ды іншыя краіны Еўропы, “Транснафта” паведаміла сваім еўрапейскім кліентам, што прычынай спынення паставак сталі дзеянні Беларусі, якая, нібыта, незаконна пачала адпампоўваць нафту з трубы дзеля сваіх патрэбаў.



http://zagorski.livejournal.com Алег Загорскі

Стала відавочна, што гэта і ёсць казырная карта, на якую разлічвае афіцыйны Мінск. Разлік рабіўся на тое, што Расія не захоча яшчэ больш псаваць без таго няпростыя адносіны з заходнімі пакупнікамі сваіх энергарэсурсаў і адновіць пампаванне нафты.

Але Масква, вуснамі таго ж Шаронава, усклала на Беларусь усю адказнасць за немагчымасць забяспечыць кантрактныя пастаўкі на Захад. Сітуацыю з прыпыненнем транзіту МЭРГ назвала “форс-мажорам”. Пад гэтым тэрмінам маецца нешта непрадказальнае і неперааадольнае – як, напрыклад, цунамі альбо паводка. Такім чынам Аляксандра Лукашэнку параўналі са стыхійным бедствам. Еўропа не стала абараняць Беларусь (як гэта было ў выпадку з Украінай год таму, калі Расія спыніла пастаўкі газу). Наадварот, большасць еўрапейскіх палітыкаў палічылі вінаватым у распальванні канфлікту афіцыйны Мінск.

Больш за тое, і Масква паказала, што цырымоніцца з саюзнікам больш не збіраецца. У якасці ўмовы пачатку перамоваў з беларускім бокам Масква назвала скасаванне транзітнага мыта.

Міністэрства эканамічнага развіцця дало зразумець, што Расія можа ўвогуле адмовіцца купляць усю беларускую прадукцыю. А гэта будзе балючым ударам для беларускай эканомікі, паколькі Расія застаецца асноўным пакупніком беларускіх трактараў, самазвалаў, матораў і шмат чаго яшчэ.

8-га студзеня ўвечары ў Маскву тэрмінова вылецела дэлегацыя на чале з намеснікам міністра эканомікі РБ Уладзімірам Найдунавым. У яе ўвайшлі таксама намеснікі міністра замежных спраў і міністра юстыцыі. Але ў аўторак дэлегацыю спачатку не пусцілі далей прыёмнай. Прэзідэнт Пуцін праводзіў нараду з міністрамі, каб вызначыць – на якіх умовах і з якога пункту пачынаць перамовы з Мінскам. Пуцін выказаў незадаволенасць тым, што ў выніку дамовы Газпрома з Беларуссю расійскі бюджэт, нібыта, губляе 3,3 мільярды даляраў. Адначасова ён загадаў ураду весці перамовы з беларускім бокам наконт мытаў, а расійскім кампаніям – часова скараціць здабычу нафты.

Толькі позна ўвечары 9-га студзеня пачаліся перамовы віцэ-прэм’ера РБ Андрэя Кабякова з міністрам эканамічнага развіцця РФ Германам Грэфам.

Чым скончацца перамовы па нафце, прадказаць на момант напісання гэтага матэрыялу цяжка. Але большасць аналітыкаў сыходзяцца на тым, што Крэмль не даруе апошніх захадаў свайму “саюзніку”, паколькі ў гэтым выпадку Масква губляе твар. Маскве патрэбная безумоўная капітуляцыя Лукашэнкі. У выпадку адмовы “капітуляваць” кіраўніцтва РБ апынецца перад неабходнасцю ваяваць на два франты – з Расіяй і Заходняй Еўропай. Ваяваць на два франты не ўдавалася яшчэ нікому. Але, з іншага боку, цяперашні кіраўнік РБ не аднойчы дэманстраваў, што для яго вайна, паводле расейскай прымаўкі – “мать родна”.

**Алег Ман**

P.S. Увечары 10 студзеня ўрад РБ скасаваў мыта на транзіт нафты.

**КАЛІ Ў ВАС НЯМА ІНТЭРНЭТУ, А ВЫ ХОЧАЦЕ РЭГУЛЯРНА АТРЫМЛІВАЦЬ ПАПЯРОВУЮ ВЕРСІЮ “СВАБОДЫ” ПРАЗ ПОШТУ, ДАШЛІЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, ВАШ АДРАС SMS-ПАВЕДАМЛЕННЕМ НА НУМАР:**
**+370 687 42 185**
**(КОШТ SMS-ПАВЕДАМЛЕННЯ – 150 БЕЛАРУСКІХ РУБЛЁЎ).**
**ВАШ АДРАС БУДЗЕ ВЯДОМЫ ТОЛЬКІ РЭДАКЦЫІ І ТОЛЬКІ ДЛЯ ПАДПІСКІ**

# З НОВЫМ ГАЗАМ, ПРАФЕСАР!

## АЛЬБО ВАЗЬМІЦЕ МЯНЕ НА ЎТРЫМАННЕ

Газета "Рэспубліка" друкуе водгукі сваіх чытачоў на гандлёвы канфлікт Беларусі і Расіі. Крыўда і абурэнне апанавалі, паводле газеты, людзей розных прафесій і ўзростаў:

*"Михаил АНИКЕЕВ, председатель Горецкого райисполкома:*

*— Район у нас приграничный, и поэтому нефтегазовый спор Беларуси и России воспринимается с особой болью и сожалением.*

*Алексей ИСАЕВ, директор и художественный руководитель Белорусского государственного музыкального театра:*

*— Мне, как человеку, родившемуся в России, сегодня очень стыдно за российское правительство и его действия в отношении дружественного народа. Давно живу в Беларуси, очень люблю эту страну, и вся моя семья очень переживает по поводу последних событий.*

*Валерий НЕКРАСОВ, заведующий отделом УП «Институт НИПТИС», г. Минск:*

*— Мое личное мнение — проблему с газом надо было, конечно, решать по-другому. Россия должна была пойти на какие-то уступки, все-таки мы строим Союзное государство. К тому же еще неизвестно, принесут ли нашим соседям эти деньги большую пользу или разойдутся мелкими ручейками. Пока газовый конфликт на мне никак не отразился, но, я думаю, в дальнейшем нам всем придется экономить".*

Цікава, можа, хто з гэтых трох радзецеляў славянскай дружбы хацеў бы ўзяць мяне і маю сям'ю на ўтрыманне? А што? Мы славяне. Дружыць будзем з гаспадарамі да скону дзён і адносна нядорага. І, можа быць, хто-небудзь з іх мне растлумачыць, чаму абарона Расіяй сваіх нацыянальных інтарэсаў называецца ледзь не агрэсіяй, а звычайная спекуляцыя чужым таварам лічыцца брацкім учынкам?

Надзвычай здзівіў прафесар-літаратуразнаўца Адам Мальдзіс, які ў "Советской Белоруссии" адкрыў сваю рубрыку "Ворчания деда Адама». Спадара Адама апанавала нейкая малазразумелая радасць з сумнеўных прычынаў:

*"Что порадовало в новогодний день? Что мы наперекор скептикам остались с газом, «с трубой», что государство проявило недюжинную стойкость, борясь за интересы граждан буквально до самых последних минут старого года. Решение принято нелегкое, но, как мне, старому ворчуну, кажется, оптимальное. И для нас, и для восточных родственников, и для Западной Европы, интересы которой не будут нарушены. Что еще порадовало? А то, что главный новогодний фейерверк на этот раз был перенесен к интеллектуальному центру Минска – Национальной библиотеке. И что наконец был открыт торгово-рекреационный центр «Столица».*

Як па-новаму і незнаёма выглядае шаноўны прафесар пасля навагодніх святаў. Яшчэ пара такіх радасцяў і паважанага навукоўца, глядзіш, на БТ камэнтатарам запросяць.

І на завяршэнне – цытата з "ЛІМ"а, які без купюраў надрукаваў прамову Мікалая Чаргінца на з'ездзе ягонага Саюза пісьменнікаў. Вось, што Чаргінец сказаў пра Саюз беларускіх пісьменнікаў – той, дзе Рыгор Барадулін, Ніл Гілевіч, Уладзімір Арлоў, Вольга Іпатава, дзясяткі іншых таленавітых і вядомых не толькі ў Беларусі літаратараў:

*"Зусім нядаўна ладзілася іхнае зборышча, названае імі з'ездам. Дык вось "з'езд" гэты адкрыўся выкананнем гімна "Магутны Божа", словы якога сачыніла фашыстоўская паслугачка Наталля Арсеннева, якая асабіста "здавала" фашысцкім акупантам нашых падпольшчыкаў: вядомы факт, калі аднаго маладога чалавека па яе даносе акупанты аблілі бензінам і спалілі жыўцом. Успомнім і пра тое, што ў часы Зянона Пазняка і Станіслава Шушкевіча арсенеўскую падробку актыўна спрабавалі зрабіць... дзяржаўным гімнам нашай краіны. А так званы "дзяржаўны сцяг", якому да гэтага часу пакланяюцца некаторыя?.. Уводзіць у падман літаратурную грамадскасць ім усё цяжэй, бо радавыя члены іх суполкі ўсё больш актыўна пераходзяць пад наш, сапраўды дзяржаўны сцяг. Некалькі пісьменнікаў-ветэранаў нават удастоены звання "Ганаровы член Саюза пісьменнікаў Беларусі". Усім, хто своечасова падаў дакументы, выдадзеныя членскія білеты новага ўзору. Усё гэта – значныя прыкметы адраджэння і абнаўлення беларускай пісьменніцкай арганізацыі".*

Я здагадваўся, што ў тым СП "адраджэннем" называюць не новыя кнігі, не выдавецкія планы, не паэтычныя імпрэзы, а пасведчанні для новых членаў. А што тычыцца словаў пра Арсенневу і нацыянальны сцяг... Не выкідайце першы нумар "ЛІМ"а за гэты год. Можа стацца, што да канца году ён паспее састарэць. І адначасова стаць абвінаваўчым дакументам.

**Алесь Канюціч**



# "БІЦЕ Ў СЭРЦЫ ІХ... МЯЧАМІ"

## ПРА "ВАЙНУ", КАЛЯДКІ І КАБІНЕТНАЕ МОВАЗНАЎСТВА

Пачалася беларуска-расійская газавая вайна. Чым закончыцца – невядома. Але ў народа паспалітага ў галаве ўжо стаіць чмур і туман, як пасля "чаромхі". Ад любімых радыёстанцыяў хацелася б ясных, простых тлумачэнняў – як, да прыкладу, жывуць суседнія Літва і Польшча з высокімі коштамі на газ? Тады б кожны слухач вольных радыёстанцыяў мог пераканаць свайго суседа, які яшчэ замежнага радыё не слухае, у перавагах жыцця не на халяву, а "па-чэснаму", па-гаспадарску. Калі кожны за ўсё мусіць плаціць.

На развітанне з Калядамі. У гэтыя святочныя дні на радыёстанцыях круцілі шмат музыкі. Я слухаю радыё на сярэдніх хвалях у дыяпазоне 612 кГц і, на жаль, на ўсіх станцыях ні разу не пачуў аўтэнтычнай каляднай песні ў выкананні бабуляў. Ні разу не пачуў калядак Вальжыны Цярэшчанкі ці гурта "Ліцьвіны". Толькі многа-многа, замест калядак, усялякіх рэвалюцыйных "чырвоным па беламу" і "цвіком па шкле". Хоць ты сам наспявай калядку…

Моўная заўвага – для спартовых фанатаў. Неяк аднаго разу Юрась Бушлякоў з Радыё Свабода расказваў пра футбол і адзначыў, што на адным стадыёне сабраліся заўзятары і пад чырвона-зялёным, і пад бел-чырвона-белым сцягамі: "І тыя, і тыя разам заўзелі за сваю каманду". Юрась, відаць, не быў на тым стадыёне, а пераглядаў дома каля тэлевізара. Бо калі б ён там, на трыбуне сказаў "заўзелі", дык суседзі, напэўна, не зразумелі б, пакрыўдзіліся і далі па зубах. Гэтае слоўца – плод кабінетнага мовазнаўства і, на мой погляд, зусім не адпавядае таму азартнаму, жывому працэсу, які адбываецца на трыбунах. Пакуль ня знойдзена лепшае слоўца, я б выкарыстоўваў тэрмін "балець". Адзін малады балельшчык нават верш такі напісаў:

"Біце ў сэрцы іх, біце мячамі,<br>Не давайце чужынцамі быць,<br>Хай пачуюць, як сэрца начамі<br>Аб любімай камандзе баліць".

**Сяржук Вітушка**

Стрэмкі

# АСКЕПКІ ЛЮСТРА

## ПРЫГАЖОСЦЬ – СТРАШНАЯ СІЛА

Сцяжынка да доміка, які мы набылі гадоў дзесяць таму, вырваўшыся з бетонна-панельных джунгляў, была абсаджана рознымі дрэвамі – яблынямі, вішнямі, грушамі. Хараша было вечарамі, у паўзмроку, выйсці і пацешыць вока краявідам, што нагадваў палотны старых майстроў.

Неўзабаве суседні ўчастак набыў малады, гадоў трыццаці чалавек – сталяр з прысадзістай постаццю і дужымі рукамі. Першае, што ён зрабіў, калі пераехаў з сям'ёй на новае месца, – выразаў усе дрэвы. Каб не зацянялі грады.

Здаўна мяне ўражвае і прыгнятае жудасная якасць людской натуры: глядзець і не бачыць, слухаць і не чуць... Нібы заселі людзям у вачах аскепкі д'ябальскага люстра з андэрсенаўскай казкі – і не дазваляюць ім распазнаць Прыгажосць.

Дрэвы... У Беларусі ўвогуле вядзецца татальная, на вынішчэнне, вайна са старымі дрэвамі. Распачатая бальшавіцкім рэжымам і падхопленая цяперашнім.

Мабыць, яны знішчаюцца, як сведкі, што зашмат чулі і бачылі.

Аднак не толькі ў адносінах да прыгажосці прыроды людзі бываюць сляпымі і глухімі.

Сёння цяжка сустрэць чалавека, які не чуў бы славутых "Пораў года" Вівальдзі – іх выконваюць на канцэртах, перадаюць па радыё, імі цілімкаюць нават мабільнікі! І цяжка паверыць, што ўжо ў год сваёй смерці (1741) аўтар быў усімі забыты, і толькі ў 20-я гады XX ст. адкрыты нанова, а сапраўды папулярны стаў толькі ў другой палове таго стагоддзя – праз дзвесце гадоў!

Сам вялікі Бах быў забыты больш чым на сотню гадоў! Батычэлі – таксама.

Або аўстрыйскі мастак Густаў Клімт. Сёння ягоны "Пацалунак", бадай, папулярны гэтаксама, як славутая "Джаконда". А яшчэ ў 1970-я гады гэтае імя нават не згадвалася ў падручніках гісторыі мастацтва. А ўкладальнікі таўстога альбома, выдадзенага ў ГДР у 1967 годзе "Прыгажосць жанчыны ў мастацтве", не палічылі патрэбным змясціць туды хоць бы адзін твор Клімта – творцы, які ўсё жыццё гэту самую прыгажосць жанчыны і апяваў.

Опера Бізэ "Кармэн" на прэм'еры была так высмеяна і асвістана, што аўтар не вытрымаў ганьбы, захварэў і памёр...

Гэткіх прыкладаў – безліч. А – архітэктура! Любуючыся старой Вільняй, я думаю: магчыма, у гэтых дамах жывуць людзі, якія радуюцца ўтульнасці старога горада, а самі ствараюць... бетонна-шкляна-сталёвы праспект Канстытуцыі, дзе ўтульна толькі скразнякам.

"Прыгажосць – страшная сіла!" – у гэтай іранічнай фразе са старой кінакамедыі заключана праўда.

Мабыць, яна сапраўды страшная – для нейкіх цёмных сілаў, калі тыя твораць такія перашкоды ў галовах на шляху да яе.

У Вільні жыве адна з найлепшых сучасных пісьменніц Літвы – Юрга Іванаўскайтэ, лаўрэат нацыянальнай прэміі (радасць знаёмства з яе прозай у беларускіх чытачоў яшчэ наперадзе).

Памятаю яе з гадоў сумеснай вучобы ў мастацкім інстытуце: усе шэсць гадоў яна прахадзіла ў адной і той жа чорнай спадніцы і гэткага ж колеру выцягнутым швэдры. Хоць была не з беднай сям'і.

Спатрэбілася аб'ехаць увесь свет ад Амерыкі да Тыбету, перанесці нялюдскія пакуты лячэння анкалагічнай хваробы, каб прыйсці да такой думкі: "Мне здаецца, ружовы колер дыктатары "добрага густу" дыскваліфікавалі зусім без патрэбы. У прыродзе так шмат цудоўных ружовых адценняў: неба перад узыходам сонца, ружы, лотаса, пялёсткаў міндаля, фламінга, ружовы кварц... Так званы "руж" надае жыццю надзею, лёгкасць і чары бесклапотнасці – усяго гэтага так трэба, калі абрынешся на дно змрочных і ліпкіх, нібы дрыгва, часам – безнадзейных пакутаў".

І першае, што яна зрабіла пасля выздараўлення, – фотасесію ў самых прыгожых і каляровых строях!

І калі я гляджу часам на бясполых "інтэлектуалак" у брудных портках і абвіслых швэдрах, то думаю – няўжо і вам трэба прайсці такі ж пакутны шлях, каб зразумець – прыгажосць узвышае, акрыляе...

Будзьма прыгожымі!

**Алег Аблажэй**

# ФОТАФАКТ



**Жыхар Мінска** *Леанід Кулакоў корміць семкамі вераб'я. 5 студзеня 2006 году*

# Невядомая Беларусь

**11 студзеня** 1862 году выйшла першая нелегальная беларуская газета "Мужыцкая праўда", якую выпускаў Кастусь Каліноўскі. Усяго пабачыла свет 7 нумароў. Праўды Каліноўскага баяліся не толькі царскія, але і савецкія ўлады, бо прачытаць ягоныя тэксты ў адкрытым друку ў часы БССР было немагчыма.

**12 студзеня** – дзве даты ў гісторыі беларускай сталіцы. Менавіта ў гэткі дзень у 1591 годзе Мінск атрымаў свой гарадскі герб: у блакітным полі – ушэсце Дзевы Марыі. А 12 студзеня 1895 году ў Мінску была адкрытая першая электрастанцыя. Яна знаходзілася на правым беразе Свіслачы, побач з цяперашнім цыркам. Станцыя сілкавала электрычнасцю амаль чатырыста лямпачак, палова з якіх была ў вулічных ліхтарах.

**13 студзеня** 1660 году маскоўскае войска князя Хаванскага захапіла Брэст. Горад быў цалкам спалены, а жыхары амаль пагалоўна забітыя. Такі адзін з эпізодаў самай страшнай у гісторыі Беларусі трынаццацігадовай вайны, калі загінуў кожны другі беларус.

**14 студзеня** – стары Новы год. Ён адзначаецца паводле юліянскага календара або паводле старога стылю. У народзе гэты дзень называлі Васіллем. Лічылася, што ўсё, што ні робіцца 14 студзеня, робіцца ўпершыню. І той, хто апярэдзіць астатніх (напрыклад, першы прынясе са студні вады), той увесь год і ва ўсіх справах будзе наперадзе.

**16 студзеня** 1919 году, усяго праз два тыдні пасля абвяшчэння БССР, тэрыторыя савецкай Беларусі была радыкальна зменшана на карысць Расійскай Федэрацыі. У склад РСФСР былі забраныя Віцебская, Магілёўская і Смаленская губерні.

**17 студзеня** 1732 году прыйшоў на свет апошні кароль Рэчы Паспалітай Станіслаў Аўгуст Панятоўскі. Кажуць, што быў ён свядомым беларусам і нават прозвішча сваё па-польску пісаў праз «у».

# АДЗІНСТВА ПРОЦІЛЕГЛАСЦЯЎ

## ДУМКІ ПРЫ НАЗІРАННІ ЗА ЎРУЧЭННЕМ ПРЭМІІ "ЗА ДУХОЎНАЕ АДРАДЖЭННЕ"

8-га студзеня паводле традыцыі адбылося ўрачыстае ўручэнне прэміі "За духоўнае адраджэнне". Уручалі прэміі сумесна яе фундатары – дзяржава ў асобе Аляксандра Лукашэнкі і царква ў асобе Патрыяршага экзарха ўсяе Беларусі Філарэта. Цырымонія транслявалася на 1-м канале дзяржаўнага беларускага тэлебачання адразу пасля "Панарамы", наскрозь прасякнутай духам гандлёвай вайны з Расіяй. Духам, прабачце за таўталогію, далёка не міралюбным.

Мабыць, пад уздзеянням пабачанага ў інфармацыйных сюжэтах, падалося, што Філарэту пачувалася ў той вечар на сцэне не надта ўтульна. Магчыма, яму думалася ў той момант пра тое, што зусім нядаўна Міжнародная фундацыя адзінства праваслаўных народаў прысудзіла прэмію "Газпрому" за ўмацаванне духоўнага адзінства Расіі, Беларусі і Украіны, і што ўручаць тую прэмію 21 студзеня будзе асабіста галава Рускай праваслаўнай царквы патрыярх Маскоўскі Алексій.




belzhaba.com

Што насамрэч думаў Філарэт, мы ніколі не даведаемся. Як не ведаем, за якія менавіта заслугі ў справе "духоўнага адраджэння" сёлета адзначаны, сярод іншых, галоўны рэдактар газеты "Советская Белоруссия" Павел Якубовіч. Нашчадкі разбяруцца. Але цікава, што зусім яшчэ нядаўна "СБ" апублікавала вялізны артыкул намесніка кіраўніка адміністрацыі прэзідэнта, акадэміка Анатолія Рубінава, у якім афіцыйны дзяржаўны ідэолаг адстойвае вяршэнства матэрыяльнага над духоўным, а саму рэлігію трактуе як "дагматычнае вучэнне, заснаванае на веры". Рэлігія, на думку навукоўца, адыгрывае ў сённяшняй Беларусі шкодную ролю, бо "узмацненне ўплыву рэлігіі азначае адначасова аслабленне ўплыву дзяржавы, дзяржаўнай ідэалогіі". Артыкул выклікаў тады абурэнне ерархаў праваслаўнай царквы і ў тым ліку – мітрапаліта Філарэта, які нават накіраваў скаргу Лукашэнку на акадэміка-атэіста.

Але заўважных наступстваў пасланне не мела, і ўжо праз некалькі тыдняў кіраўнік дзяржавы і мітрапаліт дэманстравалі са сцэны непарушнае адзінства.

Цікава было назіраць пры гэтым, як лаўрэаты дзяржаўна-царкоўнай прэміі выходзілі на сцэну. Яны накіроўваліся адразу да Лукашэнкі, але па дарозе ім трэба было прайсці міма Філарэта – так, відаць, была задумана тэлерэжысёрам. Нехта хуценька ўкленчваў перад мітрапалітам, цалуючы яму руку, нехта кланяўся яму на адлегласці, паклаўшы руку на сэрца, а нехта ў апошні момант ківаў Філарэту галавой, быццам выпадковаму знаёмаму. Галоўнае было атрымаць прэмію, кветкі ды іншыя атрыбуты асабіста з рук першай асобы. Усё ў адпаведнасці з ідэйнай устаноўкай акадэміка Рубінава аб вядучай і першаснай ролі дзяржавы і яе кіраўніка ў жыцці грамадства, у тым ліку сацыяльнай ерархіі.

Цырымонія, трэба аддаць належнае арганізатарам, вялася па-беларуску. Але кіраўнік дзяржавы, як і патрыяршы экзарх Беларусі, традыцыйна выступалі на рускай мове. Напярэдадні, падчас наведвання Катэдральнага сабора, Лукашэнка ў сувязі з нафтагазавым канфліктам гаварыў аб тым, што суверэнітэт і незалежнасць краіны трэба берагчы – як і хрысціянскія каштоўнасці.

Але за 15 гадоў незалежнасці дзяржаўнае тэлебачанне, як і дзяржаўнае кіраўніцтва, відавочна, так і не навучыліся шанаваць і берагчы беларускую мову, без якой не можа быць адраджэння нацыі – ні духоўнага, ні якога б то ні было іншага.

**Максім Пешкаў**

**МАТЭРЫЯЛЫ НЕЗАЛЕЖНАЙ ГАЗЕТЫ «СВАБОДА» ВЫ МОЖАЦЕ ЧЫТАЦЬ ТАКСАМА Ў ІНТЭРНЭЦЕ НА САЙЦЕ**

**VILNIA.COM**

**У РАЗДЗЕЛЕ *"АРХІЎ"* ВЫ МОЖАЦЕ ТАКСАМА ЗНАЙСЦІ АПОШНІЯ НУМАРЫ НАШАЙ ГАЗЕТЫ Ў ФАРМАЦЕ PDF; ЧЫТАЙЦЕ, ДРУКУЙЦЕ, ДАЙЦЕ ПАЧЫТАЦЬ ІНШЫМ**

**"СВАБОДА" БУДЗЕ ЗА НАМІ!**

**Заснавальнік** ТАА "Тут і цяпер" **Адрас** 220013 г. Менск, пл. Каліноўскага, 1-а
**Галоўны рэдактар** А. Уласаў (email: gazeta@tyt.by) **Тыраж** 299 экзэмпляраў